## СЕРДЗЮКОЎ ІВАН ІВАНАВІЧ – 210

Нарадзіўся на Палтаўшчыне (Украіна) у 1803 г. Вучыўся ў Чарнігаўскай гімназіі, Канатопскім вучылішчы, у Харкаўскім універсітэце. Працоўную дзейнасць пачаў у 17 гадоў. Даслужыўся да пасады столаначальніка ў канцылярыі ваеннага губернатара. Адначасова вёў судовыя справы мясцовых памешчыкаў. У 1832 г. прымаў удзел у фарміраванні казачых палкоў, за што быў узнагароджаны дыяментавым пярсцёнкам.

У 1842 г. І. Сердзюкоў пераязджае на Мсціслаўшчыну ў маёнтак Кудрычы, які дастаўся ў спадчыну яго жонцы. Тут ён пражыў 44 гады, стаў вядомым навукоўцам-гаспадарнікам. Яшчэ напярэдадні адмены прыгоннага права, ён вёў гаспадарку, у якой праглядваліся капіталістычныя рысы. У маёнтку будаваліся млыны, гаспадарчыя памяшканні, акультурваліся лугі, будаваліся асушальныя і арашальныя каналы, засыпаліся суфазійныя западзіны, ужываліся мінеральныя ўгнаенні і г.д.

І. Сердзюкоў быў чалавекам дзяржаўнага мыслення. Ён пісаў і падаваў розныя праекты па пытаннях паляпшэння выкарыстання зямель у розныя інстанцыі (чыноўнікі на іх мала звярталі ўвагі), будаваў дарогу ў Крычаў паміж Сожам і Чорнай Рэчкай. Ён шмат пісаў навуковых прац і публіцыстычных артыкулаў. У «Земледельческой газете», з якой актыўна супрацоўнічаў у 1844–1850 гг., і асобнымі брашурамі апублікаваў некалькі прац – «О ценах на сельскохозяйственные произведения», «О болезни овец», «О белорусском хозяйстве», «О скотоводстве», «Испорченное и поправленное хозяйство», «Народные приметы и метеорология», «Климатология Мстиславского уезда» і інш. Праца «Описание Мстиславского уезда» удастоена Ганаровага водзыва вучонага камітэта Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. У 1867 г. у «Могилевских губернских ведомостях» ён апублікаваў артыкул «Мысли о белорусском хозяйстве».

І. Сярдзюкоў вёў шырокую перапіску па аграрных пытаннях з гаспадарнікамі розных куткоў Расіі. У 1850 г. ён прызначаецца членам-карэспандэнтам Вольнага эканамічнага таварыства. У вольны час, для «душы» напісаў на ўкраінскай мове некалькі камедый, аперэт, склаў «Малороссийский словарь». Памёр у 1886 г. Пахаваны ў маёнтку Кудрычы.

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова